Падтрымай "Вясну" на PATREON

Пружаны: жанчыну асудзілі да года калоніі за "абразу Лукашэнкі". Дома ў яе засталося каля 80 жывёлаў

24.05.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, грамадства, ціск, дыфамацыя



У машыне — Людміла Кузняцова

У Пружанах 53-гадовую Людмілу Кузняцову асудзілі да года пазбаўлення волі за "абразу Лукашэнкі" па ч. 1 арт. 368 Крымінальнага Кодэксу РБ. Жанчына была арыштаваная ў залі суда, а ў яе дома засталося каля 80 жывёлаў.

У пятніцу 21 траўня суддзя **Вадзім Мазоль** разгледзеў у судзе Пружанскага р-на справу ў дачыненні да мясцовай жыхаркі **Людмілы Кузняцовай**. Паводле абвінавачання, жанчына 12 жніўня 2020 размясціла з акаўнта мужа ў сацсетцы "Вконтакте" доўгае паведамленне з выразамі ў адрас Лукашэнкі.

"Размяшчала інфармацыю для сябе"

На судзе Людміла паўтарала, што *"размяшчала інфармацыю для сябе"*. І што не ўсведамляла, што яе паведамленне было відаць усім, хто заходзіў на старонку яе мужа. Адзначала, што на старонцы публікавала фатаграфіі жывёл, якіх ратуе — а то паведамленне размясціла публічна "па памылцы".

Адказваючы на пытанні, што Людмілу падштурхнула апублікаваць такі тэкст, яна патлумачыла: перад гэтым у інтэрнэце ўбачыла відэа, *"з-за якога ўсю ноч не спала, і вось яно падштурхнула на гэта. Калі ў Менску збілі сівога старога. Зламалі яму руку, ён крычаў "Сынок, дай руку"*. Пасля гэтага відэа, са слоў Людмілы, яна пачала вывучаць іншыя навіны пра тое, што адбываецца ў краіне, паведамленні ад лекараў. І пасля, як яна думала, размясціла ў сацсетцы для сябе тэкст.

У апошнім слове Людміла толькі і казала што пра сваіх гадаванцаў: *"Я проста 10 жывёл кармлю з бутэлечкі, усяго 80 жывёл кармлю. Я за іх баюся. [..] За апошнія 2 месяцы ўладкавала 25 шчанюкоў, усе бяздомныя"*. І, са слязамі на вачах, сказала: *"Я прашу ва ўсіх прабачэння, каго пакрыўдзіла"*.

"Негатыўнае стаўленне да дзеючай улады"

Мяркуючы па матэрыялах справы, разбіральніцтва пачалося пасля ліста ад нейкага грамадзяніна ў Пружанскае РАУС. Там была спасылка на профіль мужа Людмілы ў Вконтакте, а таксама скрыншоты, *"якія сведчаць аб негатыўным стаўленні да дзеючай улады"*. А праведзеная пасля судова-лінгвістычная экспертыза ўстанавіла, што ў адным паведамленні *"маецца негатыўная ацэнка прэзідэнта РБ"*.

Дзяржабвінавачанне запрасіла жанчыне год пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму, яна ўзятая пад варту ў залі суда. Пасля гэтых слоў абвінавачаная пачала паўтараць, што ёй нельга пад варту, таму што ў яе дома жывёлы некормленыя: *«Вы што, там жывёлы, яны чакаюць, есці хочуць»*. Прысуд суда Кузняцовай Людміле апынуўся такім, якім запытвала дзяржабвінавачанне: год пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму па ч.1 арт. 368. На жанчыну надзелі кайданкі ў зале суда, пакуль яна галасіла: *"Мамачкі, а як жа жывёлы! Яны ж непакормленыя, без мяне памруць!»*

Пасля абвяшчэння прысуду ўжо актыўна шукаецца новы дом усім жывёлам. **Дапамагчы можна, звязаўшыся па наступных нумарах: +375 (29) 532 46 69, +375 (44) 513 76 03 (вайбер)**

Твитнуть







СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17

ГАЛОЎНАЕ

"Я, напэўна, проста памру тут": хто з палітвязняў знаходзіцца ў асаблівай рызыцы за кратамі



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

"Бяляцкі, прасі літасці!" У Швецыі прадставяць спектакль-чытку паводле твораў Бяляцкага і Знака

Валерыя Цапкалу завочна асудзілі да 17 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму (дапоўнена)

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

